Министерство образования Республики Беларусь

*Учреждение образования*
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

Исторический факультет

Институт истории Национальной академии наук Беларуси

# 1917 ГОД В ИСТОРИЧЕСКИХ СУДЬБАХ НАРОДОВ БЕЛАРУСИ

*Материалы Международной научно-теоретической конференции*

*г. Минск, 22 декабря 2017 г.*

Минск
БГПУ
2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)
Т936

Печатается по решению Совета исторического факультета БГПУ

Р е д к о л л е г и я:
кандидат исторических наук, доцент *А. В. Касович (отв. ред.);*
кандидат исторических наук, доцент *С. П. Шупляк;*
кандидат исторических наук, доцент *А. А. Корзюк*

Р е ц е н з е н т ы:
доктор исторических наук, профессор *А. П. Житко;*
доктор исторических наук, профессор *А. М. Лютый*

Т936 **1917 год** в исторических судьбах народов Беларуси : материалы Международной научно-теоретической конференции, г. Минск, 22 декабря 2017 г. / Белорус. гос. пед. ун-т им. М. Танка ; редкол.: А. В. Касович (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГПУ, 2017. – 252 с.
ISBN 978-985-541-414-9.

В сборнике представлены материалы исследований ученых Беларуси, России, Казахстана, Туркменистана, студентов, магистрантов, учащихся учреждений общего среднего образования, посвященные 100-летию Октябрьской революции.

Адресуется преподавателям, магистрантам и студентам вузов.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.3(4Беи)**

**ISBN 978-985-541-414-9**

© Оформление. БГПУ, 2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

2. Вышэйшыя ваенна-авіяцыйнае вучылішча лётчыкаў імя героя Савецкага Саюза А. К. Сярова [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : https://ru.wikipedia.org. – Дата доступу: 09.12.2017.
3. Вершаль, П. І. «Служылі два таварышы…» / П. І. Вершаль // Беларусь. – № 6. – 1982. – С.12.
4. Вершаль, П. І. Подзвігу жыць : [аб лётчыку-герою Пятру Гучку] / П. І. Вершаль // Піянер Беларусі. – 1983. – 14 крас.
5. Лісты П. У. Дольнікава да піянераў дружыны імя Пятра Гучка / Экспазіцыйныя матэрыялы Гісторыка-краязнаўчага музея «Гісторыя п. Міханавічы» (далей – МСШМ).
6. Запісы ўспамінаў Бачыла (Гучок) Галіны Іосіфаўны. Красавік 2005 г. / МСШМ.
7. Ліст да Вольгі Лявонцьеўны Гучок ад камсорга. Фотакопія // МСШМ.
8. Чапурнова, Л. Героі штурму Берліна: [аб лётчыку-герою Пятру Гучку] / Л. Чапурнова // Мінская праўда. – 1958. – 9 лют.
9. Фотакопія артыкула Janusz Plowecki «Matka Sokola» / «Жыцце Чэнстахова» ад 12. 09. 1967 г. / МСШМ.

# ЭВАЛЮЦЫЯ СІСТЭМЫ ДЗЯРЖАЎНАГА КІРАВАННЯ ЛЯСНЫМІ РЭСУРСАМІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (КАНЕЦ XIX – ПАЧАТАК XX ст.)

***Лугач І. В.,*** *аспірант, БДПУ, г. Мінск*

У канцы XIX – пачатку XX ст. эканамічнае развіццё беларускіх губерняў характарызавалася структурнай трансфармацыяй гаспадаркі. Неабходнасць задавальнення як мага большага аб’ёму патрэбаў ва ўмовах абмежаванасці рэсурсаў патрабавала ад суб’ектаў эканамічных адносін мадэрнізацыі вытворчасці і сістэмы кіравання рэсурсамі, вялікую долю сярод якіх складалі прыродныя. Па-ранейшаму адну з важнейшых роляў у эканамічным развіцці Беларусі адыгрывала лясная гаспадарка. Прадукты, што атрымлівалі ў ходзе арганізацыі дрэваапрацоўчай вытворчасці, выкарыстоўваліся для будаўніцтва ваенных караблёў і грамадзянскіх судоў, у якасці паліва, будаўнічых і дапаможных матэрыялаў і дэталей і г. д. Асабліва эксплуатацыя лясных рэсурсаў узмацнілася ў сувязі з удасканаленнем сеткі шляхоў зносін паміж разнастайнымі рэгіёнамі імперыі. З развіццём капіталістычных адносін змянялася і арганізацыйная структура лесаперапрацоўчай вытворчасці. Павялічылася колькасць у краі дрэваапрацоўчых, запалкавых і кардонна-папяровых прадпрыемстваў [4, с. 16]. Рызыка сур’ёзнага знясілення лясоў абумоўлівала неабходнасць удасканалення сістэмы дзяржаўнага кіравання ляснымі рэсурсамі на тэрыторыі беларускіх губерняў.

21 сакавіка 1894 г. Міністэрства дзяржаўных маёмасцей было рэарганізавана ў Міністэрства земляробства і дзяржаўных маёмасцей. Да юрысдыкцыі міністэрства, у прыватнасці, належаў агульны нагляд за выкананнем правілаў аховы лясоў, а так-



РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

сама заахвочванне лесаразвядзення і ўпарадкавання лясоў на прыватных землях. Лясны дэпартамент з Корпусам ляснічых і Лясны спецыяльны камітэт працягвалі сваё існаванне ў складзе міністэрства.

Лясны спецыяльны камітэт складаўся са старшыні, які быў адным з членаў савета міністра, члена, які заведваў бюро, трох членаў-спецыялістаў па лясной частцы і аднаго справавода. Разгляданню ў камітэце падлягалі праекты статутаў лясных і лесапрамысловых таварыстваў, прапановы аб спосабах збірання звестак для статыстыкі па лясной прамысловасці, агульныя меры па лесаўпарадкаванні і лесаразвядзенні і ўсе пытанні, якія міністр знаходзіў карысным перадаваць на абмеркаванне камітэта [10; 11, с.155–161]. 6 мая 1905 г. быў выдадзены ўказ «Об учреждении комитета по земельным делам и о преобразовании Министерства земледелия и государственных имуществ в Главное управление землеустройства и земледелия». Між тым, лесаахоўныя функцыі Галоўнага ўпраўлення землеўпарадкавання і земляробства не адрозніваліся ад адпаведных функцый Міністэрства дзяржаўных маёмасцей [13].

У абавязкі лясных аддзяленняў упраўленняў дзяржаўных маёмасцей уваходзілі: апісанне, межаванне і таксацыя дзяржаўных лясоў, адасабленне іх ад лясоў іншых маёмасных статусаў, складанне планаў правільнага лесаводства, штогадовых каштарысаў лясной гаспадаркі, папярэджанне самавольных высечак лясоў, кантроль за супрацьпажарнай бяспекай і г. д. Аддзяленне такама вяло справаводства па асабістым складзе чыноўнікаў і служачых лясного ведамства. Узначальваў лясное аддзяленне губернскі ляснічы [6; 7]. На тэрыторыі беларускіх губерняў былі арганізаваны пяць адпаведных упраўленняў дзяржаўных маёмасцей. Ва ўпраўленнях службу неслі кіраўнік дзяржаўных маёмасцей, губернскі ляснічы, начальнік гаспадарчага аддзялення, чыноўнік па адмысловых даручэннях, сакратар, землямер, памочнік сакратара (пасада адпавядала пасадам архіварыуса альбо экзекутара), століначальнік, бухгалтар, памочнік століначальніка і памочнік бухгалтара [8, с. 644–645].

12 Чэрвеня 1912 г. было прынята рашэнне аб перайменаванні ўпраўленняў дзяржаўных маёмасцей ва ўпраўленні земляробства і дзяржаўных маёмасцей [12]. Упраўленні складаліся з аддзела лясной гаспадаркі, аддзела па кіраванні аброчнымі артыкуламі, аддзела, які ўключаў інспектарскую, сакратарскую і бухгалтарскую часткі і судовага аддзела. Усяго ж на ўтрыманне пяці ўпраўленняў земляробства і дзяржаўных маёмасцей, якія дзейнічалі на тэрыторыі Беларусі штогод выдаткоўвалася 85 400 руб. [11, с. 234–239].

Адзначым, што згодна з указам «О распространении права собственности владельцев на леса, в дачах их растущие» ад 22 верасня 1782 г. памешчыкі атрымлівалі права ўласнасці на ўсе без выключэння лясы, якія знаходзіліся на іх тэрыторыі і мелі права займацца продажам драўніны на ўнутраны і знешні рынкі, выплаціўшы адпаведную пошліну, устаноўленую дзяржавай [5]. Гэты ўказ больш за стагоддзе не дазваляў мясцовым органам кіравання наўпрост арганізаваць сістэму аховы лясоў, што належа-



РЭПАЗІТОРЫЙ БГПУ

лі прыватнаўласніцкім гаспадаркам. Такое становішча рэчаў выклікала істотнае паменшэнне лясных плошчаў, што штурхнула ўрад да выпрацоўкі прынцыпова новых падыходаў да вядзення лясной гаспадаркі. У выніку гэтага 4 красавіка 1888 г. было выдадзена «Положение о сбережении лесов». Захады па ахове і збераржэнні лясоў, якія значыліся ў гэтым палажэнні, распаўсюджваліся на лясы ўсёй Еўрапейскай Расіі незалежна ад іх маёмаснага статусу і толькі часова былі прадугледжаны пэўныя абмежаванні, што рабіла Палажэнне сапраўды прагрэсіўным. Былі ўстаноўлены пакаранні за парушэнне яго пунктаў. Прыбыткі, якія былі атрыманы ў выніку выплат грашовых пакаранняў і продажу канфіскаванага лесу, складалі спецыяльныя сродкі лясного ведамства [9]. Нельга абмінуць увагай тое, што «Положение о сбережении лесов» было ўключана ў якасці асобнай пятай кнігі ва «Устав лесной». Фактычна гэта Палажэнне стала першым заканадаўчым актам, які рэгламентаваў не толькі рацыянальнае выкарыстанне лясных рэсурсаў, але і абгрунтоўваў стаўленне да леса, як да ўнікальнага прыроднага багацця, якое патрабуе экалагічнай аховы [1, с. 16–17].

«Положение о сбережении лесов» з'явілася нарматыўна-прававой падставай для ўзнікнення ў галіне аховы лясоў мясцовых органаў кіравання новага тыпу – Лесаахоўных камітэтаў, якія дзейнічалі паралельна з упраўленнямі дзяржаўных маёмасцей (з 1902 г. – з упраўленнямі земляробства і дзяржаўных маёмасцей) і знаходзіліся пад старшынствам губернатара. Па некаторых справах у камітэт запрашаўся прадстаўнік ведамства шляхоў зносін. На некаторых лясных рэвізораў ускладаліся абавязкі рэвізораў-інструктараў [2, арк. 1–1ад.]. У асноўным, непасрэдны кантроль за станам лясоў ажыццяўляў лясны рэвізор. Ён павінен быў звяртаць увагу на чысціню лесасек, своечасовы вываз нарыхтаваных бярвёнаў, выбарачны ці суцэльны характар лесасек, ступень пашкоджання лесасек агнём, стан гацяў, рысчыстку просек ад маладых зараснікаў і вяршынь кварталаў ад сукоў на летні перыяд у сувязі з правіламі супрацьпажарнай бяспекі і г. д. Да таго ж лясны рэвізор павінен быў высвятляць наяўнасць і стан лясной варты [3, арк. 3–4].

Падводзячы вынік вышэйпададзенаму трэба адзначыць, што ў канцы XIX – пачатку XX ст. на тэрыторыі беларускіх губерняў сфарміравалася самадастатковая і трывалая сістэма дзяржаўнага кіраванняляснымі рэсурсамі, што можа пацвярджацца ростам даходнасці лясной гаспадаркі: толькі ў прамежак часу з 1888 па 1897 г. даходнасць ад лясоў паўночна-заходніх і прыбалтыйскіх губерняў склала 41 млн 322 тыс. руб. [14, с. 216]. Адметнай асаблівасцю адзначанага этапа стала эвалюцыя адносін дзяржавы да лесу, які стаў успрымацца не толькі як эканамічны рэсурс, але і як унікальная экасістэма, якая патрабуе пільнага нагляду.

***Литература***

1. Навасардова, Э. С. Кодификация лесного законодательства России в XIX в. / Э. С. Навасардова // Общество и право. – 2009. – № 4 (26). – С. 13–17.
2. НГАБ. – Ф. 27. Воп. 2. Спр. 1679.
3. НГАБ. – Ф. 139. Воп. 1. Спр. 369.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

4. Новицкая, Р. Е. Лесное хозяйство Беларуси. Прошлое и настоящее / Р. Е. Новицкая, Д. Н. Лепешко, Т. Ф. Добыш ; Министерство лесного хозяйства Республики Беларусь. – Минск : Редакция журнала «Лесное и охотничье хозяйство», 2013. – 615 с.
5. ПСЗРИ. – 1-е собр. – Т. 21. – Отд. 1. – № 15518. – С. 676.
6. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 13. – Отд. 1. – № 11189. – С. 405–654.
7. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 41. – Отд. 2. – № 44024. – С. 469–471.
8. ПСЗРИ. – 2-е собр. – Т. 41. – Отд. 2. – Штаты и табели. – С. 704.
9. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 8. – Отд. 1. – № 5120. – С. 148–156.
10. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 14. – Отд. 1. – № 10457. – С. 141–152.
11. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 14. – Отд. 1. –Штаты и табели. – 647 с.
12. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 22. – Отд. 1. – № 21694. – С. 645–647.
13. ПСЗРИ. – 3-е собр. – Т. 25. – Отд. 1. – № 26172. – С. 289–290.
14. Столетие учреждения Лесного департамента. 1798–1898. – СПб. : Типолитография Ю. Я. Римана, 1898. – [9], 251 с.

## ОЗАРИЧИ – ЛАГЕРЬ СМЕРТИ: СВИДЕТЕЛЬСТВО ОЧЕВИДЦА

***Ратько А. Ф.,*** *кандидат исторических наук, доцент, БГПУ, г. Минск*
***Рогова Ю. В.,*** *студент, БГПУ г. Минск*

Одной из малоизученных проблем Второй мировой и Великой Отечественной войн остается судьба бывших малолетних узников фашистских концлагерей. Особую историческую ценность для изучения данной проблемы представляют материалы устной истории. В ходе поисковой деятельности нам удалось собрать сведения о зверствах немецко-фашистских оккупантов в концентрационном лагере «Озаричи», созданный оккупантами в Великую Отечественную войну в начале марта 1944 г. в бывшем Домановичском районе Полесской области. Сведения об этих трагических событиях удалось взять у бывшего малолетнего узника концлагеря «Озаричи» Евгении Валентиновны Кравчук.

В январе 1944 г. 1-й Белорусский фронт приступил к осуществлению Калинковичско-Мозырской наступательной операции, в результате которой были заняты Калинковичи и Мозырь. В южном направлении от освобожденных городов действовали войска 61-й армии под командованием генерал-лейтенанта П. Белова, а в северном – подразделения 65-й армии во главе с генерал-лейтенантом П. Батовым, которые 20 января освободили Озаричи [1, с. 27–28].

Немецкие войска вынуждены были перейти к обороне. Командование группы армий «Центр» эвакуировало в свой тыл большое количество людей из прифронтовой зоны. Был разработан бесчеловечный план по созданию специальных лагерей на переднем крае своей обороны для помещения в них тифозных больных и других нетрудоспособных лиц, чтобы не только уберечь свои войска от неизбежной эпидемии сыпного тифа, но и создать живой человеческий щит для сдерживания наступательных операций Красной Армии. Именно такие лагеря были созданы оккупантами в районе местечка Озаричи бывшей Полесской области: первый – на болоте в 2 км западнее де-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ